# У Палітбюро ЦК КПСС

Палітбюро ЦК КПСС на пасяджэнні, якое адбылося 6 студзеня, разгледзела прапановы, звязаныя з рэалізацыяй перабудовы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, распрацаванай у адпаведнасці з устаноўкамі XXVII з'езда КПСС.

У абмеркаваных дакументах намечаны меры па істотнаму павышэнню якасці падрыхтоўкі і выкарыстання ў народнай гаспадарцы спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй. У сувязі з гэтым прадугледжваецца карэнная перабудова навучальна-выхаваўчага працэсу, пераход да падрыхтоўкі спецыялістаў шырокага профілю на базе авалодання фундаментальнымі навуковымі і прафесіянальнымі ведамі, актыўнага супрацоўніцтва з адпаведнымі прадпрыемствамі, аб'яднаннямі і арганізацыямі. Намячаецца стварыць новы арганізацыйна-эканамічны механізм узаемадзеяння вышэйшай школы і галін народнай гаспадаркі, асновай якога з'явіцца мэтавая падрыхтоўка і перападрыхтоўка кадраў па дагаворах з частковай кампенсацыяй затрат на гэтыя мэты за кошт галін матэрыяльнай вытворчасці.

Палітбюро падкрэсліла, што рашаючай умовай узмацнення эфектыўнасці навучання і выхавання будучых спецыялістаў стане паляпшэнне падбору, расстаноўкі і павышэння кваліфікацыі навукова-педагагічных і навуковых кадраў. Маецца на ўвазе перабудаваць дзейнасць аспірантуры як важнай ступені пасля-вузаўскай адукацыі. На базе вядучых ВНУ і навуковых устаноў будзе арганізавана дактарантура. Намячаецца ўвесці новы парадак атэстацыі навукова-педагагічных работнікаў, стварыць больш спрыяльныя ўмовы для прыцягнення да выкладчыцкай дзейнасці ў ВНУ буйных спецыялістаў народнай гаспадаркі і вядучых вучоных.

Вызначаны шляхі ўзмацнення ролі вузаўскай навукі ў паскарэнні навукова-тэхнічнага прагрэсу, паляпшэнні якасці падрыхтоўкі спецыялістаў, якія валодаюць новай тэхнікай. Плануецца забяспечыць у ВНУ, перш за ўсё універсітэтах, апераджальнае развіццё фундаментальных даследаванняў, павялічыць у тры—чатыры разы аб'ём доследна-канструктарскіх і эксперыментальных работ і на гэтай аснове дабіцца росту маштабаў і скарачэння тэрмінаў укаранення вынікаў навуковых распрацовак.

Распрацоўваюцца меры па далейшаму паляпшэнню матэрыяльных і бытавых умоў жыцця работнікаў вышэйшай школы, аспірантаў і студэнтаў.

У асноўным адобрыўшы дакументы, звязаныя з перабудовай дзейнасці вышэйшай школы, Палітбюро даручыла адпаведным арганізацыям прадоўжыць работу над імі, маючы на ўвазе далейшае паляпшэнне планавання падрыхтоўкі спецыялістаў, павышэнне ўзроўню тэхнічнай аснашчанасці вузаўскай навукі, удзел міністэрстваў, ведамстваў, аб'яднанняў і прадпрыемстваў у гэтай важнай справе.

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі універсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 2 (638) | Аўторак, 13 студзеня 1987 года. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. | Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

*Дзённік экзаменацыйнай сесіі*

## ЛІМІТ ВЕДАЎ... АД САМАПАДРЫХТОЎКІ

### ЦІ НЕЖАДАННЕ АСОБНЫХ СТУДЭНТАЎ ПАСПЯХОВА ВУЧЫЦЦА?

Гаманлівыя натоўпы студэнтаў каля дзвярэй вучэбных аўдыторый з раніцы і нязвыклая цішыня ў калідорах карпусоў у другой палове дня — галоўная прыкмета наступіўшай экзаменацыйнай сесіі. Яе надыход адчуваецца таксама ў бібліятэках, чытальных залах, дзе стала менш свабодных месц і прыбавілася клопатаў іх работнікам, у інтэрнатах. У апошніх не стала штодзённай прывычнай мітусні, жыццё тут нібы запаволіла свой бег.

За некалькі дзён прачытваюцца студэнтамі сотні старонак падручнікаў, канспектаў. Часта для некаторых не хапае дваццаці чатырох гадзін у сутках, асабліва перад экзаменам.

Цікавасць да вынікаў у бягучай зімовай экзаменацыйнай сесіі ва ўсіх выкладчыкаў, дэканатаў, кафедр, грамадскіх арганізацый факультэтаў — асаблівая. Яно і зразумела: ідзе праверка трываласці ведаў студэнтаў, для якіх з першага семестра гэтага навучальнага года была зменшана колькасць лекцыйных гадзін, і прыбавілася часу на самастойную падрыхтоўку. Ці выкарыстоўваўся ён для самаадукацыі, а не траціўся на іншыя другарадныя справы?

На жаль, аналіз першых выпрабаванняў студэнтаў не радуе. У прыватнасці, далёка не аптымістычны настрой выклікала знаёмства з экзаменацыйнымі ведамасцямі першакурснікаў гісторыка-філалагічнага факультэта, якія здалі экзамен па гісторыі КПСС, зарубежнай літаратуры, уводзінах у літаратуразнаўства. Так, у групе Р-11 на экзамене па гісторыі КПСС 16 студэнтаў з 27 атрымалі здавальняючыя адзнакі. Большая палова троек выстаўлена студэнтам групы БР-13 на экзамене па ўводзінах у літаратуразнаўства. Шмат пасрэдных адзнак у тых, хто здаваў зарубежную літаратуру. Пра апошні экзамен хочацца сказаць асобна. Ён лічыцца адным з цяжкіх, таму для першакурснікаў студэнты старэйшых курсаў праводзяць па ім грамадскі экзамен. На ім студэнты спецыяльнасці руская мова і літаратура паказалі нядрэнныя веды і атрымалі добрыя і выдатныя адзнакі. У асноўным трывалыя веды паказалі яны і на сапраўдным экзамене, які прымала выкладчыца С. П. Емяльянава. Іншая ж справа ў студэнтаў беларускага аддзялення. На грамадскім экзамене іх ледзь-ледзь выцягнулі на тройкі. Здавалася б, што пасля гэтага слабыя студэнты зробяць вывады: ведаў не хапае, трэба падцягнуцца, папрацаваць над канспектамі, падручнікамі. У канчатковым выніку грамадскія экзамены і ставяць сваёй мэтай: высветліць слабыя бакі ў веданні матэрыялу і ў наяўны яшчэ час паспець вывучыць добра тое, што слаба ведаеш. Аднак гэтага, напэўна, не захацелі зразумець многія студэнты гр. БР-11 і БР-12.

А што могуць прывесці ў сваё апраўданне тыя, хто не змог справіцца з залікамі і не дапушчаны да экзаменаў? Думаецца, прычына тут адна — лянота.

Калі «збоі» здараюцца ў першакурснікаў, зразумець іх лёгка—хтосьці яшчэ не здолеў прайсці адаптацыю ў студэнцкім жыцці, разгубіўся. Неапраўдана ж такое для некаторых другакурснікаў гістфіла, якія ў мінулым навучальным годзе і ў бягучую экзаменацыйную сесію цягнуцца ў хвасце. Тут трэба рабіць адпаведныя вывады. Скідак і паслабленняў гультаям больш не павінна быць.

Т. НІКАЛАЕВА.





НА ЗДЫМКАХ: 1. На экзамене па матаналізу, які прымаў доктар ф.-м. навук Р. В. Шаймуратаў, адказ студэнта гр. Ф-22 фізічнага факультэта Уладзіміра Дзюбо ацэнены вышэйшым балам. 2. Добрыя веды на экзамене па педагогіцы паказала чацвёртакурсніца матфака Галіна Жукоўская.

Фота А. Ульянкінай.

## З УЗНАГАРОДАЙ!

За плённую навукова-педагагічную дзейнасць, актыўную грамадскую работу і ў сувязі з 50-годдзем з дня нараджэння асістэнт кафедры палітэканоміі ОКРУТ Анатоль Іванавіч узнагароджаны Ганаровай граматай рэктарата, парткома і прафкома універсітэта.

*Трымайце раўненне*

## ЛЕПШАЯ ВА УНІВЕРСІТЭЦЕ

**На сумесным пасяджэнні камітэта камсамола і прафкома студэнтаў ГДУ падведзены вынікі агляду-конкурсу на лепшую акадэмічную групу універсітэта. Ёй прызнана гр. Г-51 гісторыка-філалагічнага факультэта (камсорг — Ірына Эсмантовіч, прафорг —Ніна Рудзякова, староста — Алена Пырх).**

Студэнты групы добра вучацца, прымаюць актыўны ўдзел у навукова-даследчай рабоце. 8 чалавек сталі пераможцамі вузаўскага тура алімпіяды «Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс». Навуковыя работы Ірыны Эсмантовіч і Юрыя Аляксеенкі на рэспубліканскім туры XI Усесаюзнага конкурсу студэнцкіх даследаванняў па грамадскіх навуках, гісторыі ВЛКСМ і міжнароднага маладзёжнага руху ўзнагароджаны дыпломамі I і II ступені. І. Карчэўская і Т. Пяцеліна былі ўдзельніцамі рэспубліканскай алімпіяды па педагогіцы. Студэнты групы прымалі ўдзел у археалагічных экспедыцыях АН БССР.

За выдатную вучобу і актыўны ўдзел у грамадскім жыцці універсітэта студэнтцы групы Ірыне Эсмантовіч назначана Ленінская стыпендыя, 5 выдатнікаў вучобы атрымліваюць павышанную стыпендыю.

Камсамольцы гр. Г-51 — актыўныя ўдзельнікі грамадскага жыцця факультэта і універсітэта, з'яўляюцца слухачамі факультэта грамадскіх прафесій, народнага універсітэта маральна-эстэтычнага выхавання. Многія сталі членамі КІДа «Саюз».

Чатыры студэнты — члены камітэта камсамола факультэта, Ю. Пеняэь — сакратар камітэта ЛКСМБ гістфіла, І. Эсмантовіч — член камітэта ЛКСМБ універсітэта. Тры студэнты групы выбраны ў састаў прафкома факультэта. А. Ражко выбіраўся дэпутатам раённага Савета народных дэпутатаў.

За гады вучобы група стала дружным калектывам, які жыве цікава, насычана і весела. Усе — актыўныя ўдзельнікі трэцяга працоўнага семестра, добрыя спартсмены. Ігар Варонін — пераможца рэспубліканскіх спаборніцтваў па гіравому спорту, мае ўзнагароды за выступленні на саюзных спаборніцтвах.



«ВСЕ ЯРКО, ВСЕ БЕЛО КРУГОМ...»

*Кансультацыя юрыста*

# ШТОГАДОВЫ ВОДПУСК

Штогадовы асноўны водпуск даецца рабочым і служачым адзін раз на працягу года няспыннай работы на даным прадпрыемстве або ва ўстанове. Рабочы год лічыцца з таго дня, калі работнік паступіў на работу ў даную ўстанову. Чарговасць прадстаўлення водпускаў устанаўліваецца адміністрацыяй па ўзгадненню з прафкомам. Водпуск за першы год даецца праз 11 месяцаў работы ў данай установе. У некаторых выпадках, указаных ў заканадаўстве, водпуск можа прадстаўляцца і да наступлення гэтага тэрміну. Напрыклад, жанчынам — перад водпускам па цяжарнасці і родах або непасрэдна пасля яго; асобам маладзей 18 гадоў; ваеннаслужачым, зволеным у запас і накіраваным на работу ў парадку арганізаванага набору, — пасля трох месяцаў работы; рабочым і служачым, пераведзеным з аднаго прадпрыемства на другое, калі яны адпрацавалі 11 месяцаў да і пасля пераводу. Водпуск за другі і наступны гады работы прадстаўляецца ў любы час на працягу ўсяго года ў адпаведнасці з чарговасцю (графікам). Графік павінен прадугледжваць раўнамерны ўход у водпуск работнікаў. У летні час водпуск даецца асобам маладзей 18 гадоў, навучэнцам школ рабочай моладзі, а таксама прафесарска-выкладчыцкаму саставу ВНУ і тэхнікумаў. Жанчыны, якія маюць дваіх і больш дзяцей ва ўзросце да 12 гадоў, маюць пераважнае права на выкарыстанне водпуску ў летні перыяд.

Водпуск павінен быць перанесены або падоўжаны: пры часовай непрацаздольнасці рабочага або служачага, пры выкананні дзяржаўных або грамадскіх абавязкаў. Па ўзгадненню адміністрацыі і работніка водпуск можа быць раздзелены на часткі, якія прадстаўляюцца ў розны час, але на працягу таго рабочага года, за які даецца водпуск. Перанос водпуску дапускаецца са згоды работніка і па ўзгадненню з прафкомам. На тых жа падставах дапускаецца і водзыў работніка з водпуску. Забараняецца непрадастаўленне штогадовага водпуску на працягу двух гадоў запар, а таксама — асобам маладзей 18 гадоў і работнікам, якія маюць права на дадатковы водпуск у сувязі са шкоднымі ўмовамі працы. У выпадках парушэння графіка адміністрацыяй, а таксама ўзнікшай спрэчкі па прычыне парушэння права работніка на атрыманне водпуску ў пэўны час, гэтыя пытанні разглядаюцца паслядоўна ў камісіі па працоўных спрэчках, прафкоме і судзе.

**В. РУПІН,**
**юрысконсульт ГДУ.**

*Вазьміце на заметку*

# АСОБА І КАЛЕКТЫЎ

У паўсядзённых адносінах паміж людзьмі можна і неабходна прадбачыць асаблівасці рэакцыі кожнага, яго характару і адпаведным чынам на іх рэагаваць.

Недапушчальна апраўдваць дэфекты свайго характару прыроджанымі ўласцівасцямі. Чулым, добрым, тактоўным, вытрыманым можна быць пры любым характары.

Такія рысы характару, як таварыскасць, лёгкасць устанаўлення кантактаў, аб якіх многія мараць, залежаць таксама ад прыродных і ад набытых фактараў, ад выхавання, жыццёвых абставін, навыкаў.

Нярэдка даводзіцца мець справу з асобамі, якія ў пэўных сітуацыях нараджаюць канфлікты, нярвовыя зрывы. Адна з распаўсюджаных крыніц канфліктаў, крыўд — неадпаведнасць самаацэнкі і ацэнкі акружаючых людзей. Таму неабходна заўсёды памятаць:

— падкрэсліванне пачуцця ўласнай годнасці, ганарыстасці заўсёды раздражняе акружаючых;

— прычынай залішняй крыўдлівасці можа быць неадэкватна завышаная самаацэнка. У такім выпадку лагічна не абвінавачваць людзей, якія вас акружаюць, у чэрствасці і грубасці, а знізіць асабісты «узровень прэтэнзій»;

— калі хто-небудзь адчувае цяжкае пачуццё залішняй пільнай увагі да сябе акружаючых людзей, трэба ўспомніць, што чалавеку ўласціва прыпісваць іншым тыя адчуванні, эмоцыі, жаданні, якія ён сам у гэты час перажывае;

— недапушчальна замест заўвагі па канкрэтнаму негатыўнаму выпадку даваць агульную адмоўную ацэнку асобы;

— у кожнага ёсць свае слабыя месцы, «біць» па якіх крытыкай і папрокамі нельга;

— кожнаму неабходна дастойная ацэнка яго дзейнасці, у тым ліку і пахвала, калі ён яе заслужыў. А пахвала з боку чалавека, чыёй думкай даражаць, — вялікае задавальненне і важны жыццёвы стымул. Але празмерны хвалебны паток выклікае пачуццё няёмкасці і негатывізм.

Вельмі важна ў паўсядзённых адносінах з людзьмі разумець пачуцці субяседніка. Чаму ён усхваляваны, разззлаваны, пахмурны? А галоўнае, трэба зразумець і сябе! Чаму лёгка ўзнікае дрэнны настрой, а следам за ім і канфлікт? Чаму нястрыманы ў спрэчках? Чаму эмоцыі ў некаторых выпадках становяцца адмоўнымі і ператвараюцца ў бар'ер адносін?

Эмоцыі вызначаюцца патрэбнасцямі. «Выхоўваць» у сабе і ў іншых трэба не эмоцыі (гэта немагчыма), а патрэбнасці. Адмоўныя эмоцыі часцей уласцівы тым, чые жаданні, мэты не падмацаваны рэальнымі магчымасцямі і супярэчаць імкненням іншых людзей.

Каб пазбегнуць расчаравання, крыўды, злосці з-за невыканання якога-небудзь жадання, старайцеся загадзя прадугледзець магчымыя варыянты перашкод для дасягнення новай мэты.

Поспех з'яўляецца стымулам далейшай дзейнасці і новых дасягненняў. Таму старайцеся не праходзіць міма нават невялікага поспеху іншага чалавека.

Адмоўныя эмоцыі лягчэй узнікаюць у стане стомленасці, дрэннага фізічнага самаадчування, незадаволенасці. І тады нават справядлівыя заўвагі і папрокі з боку іншага чалавека ўспрымаюцца ў «штыкі».

Каб дрэнны настрой хутчэй прайшоў, не прапускайце магчымасці радавацца нават кожнай прыемнай дробязі.

*Прапануе прафком*

# КАБ АДПАЧЫНАК БЫЎ КАРЫСНЫМ

**На зімовыя канікулы студэнты універсітэта могуць набыць ў прафкоме пуцёўкі ў санаторыі і дамы адпачынку:**

**Санаторый «Нарач» (для лячэння органаў стрававання) з 23 студзеня па 15 лютага.**

**Санаторый «Крыніцы» (органы стрававання) з 27 студзеня па 19 лютага.**

**Курсоўка ў Анапу (для лячэння органаў кровазвароту і касцёва-мышачнай сістэмы) — з 26 студзеня па 18 лютага.**

**150 студэнтаў універсітэта змогуць карысна правесці канікулы ў доме адпачынку « Чонкі». Пуцёўка разлічана на 12 дзён. Заезды — з 23 студзеня і з 28 студзеня.**

**Жадаючыя змогуць адправіцца на канікулах ў падарожжа на турпоездзе па маршруту Гомель—Брэст—Львоў—Ужгарад—Кіеў — Гомель.**

**Акрамя таго, у прафкоме студэнтаў ёсць лячэбныя пуцёўкі ў санаторый «Зеленаградск» (г. Калінінград) для лячэння сардэчна-сасудзістых захворванняў з 16 лютага па 11 сакавіка і ў санаторый «Нямунас» (г. Друскінінкай) для лячэння органаў стрававання з 25 сакавіка па 17 красавіка.**

**В. СЕНІНА,**
**нам. старшыні прафкома студэнтаў ГДУ.**

# КНІГІ—ПОШТАЙ

Магазін «Кніга — поштай» Паўночна-Заходняй канторы «Акадэмкніга» прапануе кнігі выдавецтва «Наука»:

БРУК С. І. Насельніцтва свету. Этнадэмаграфічны даведнік. — М., 1986. — 3 руб. 60 кап.

ГІСТОРЫЯ ЗНЕШНЯЙ ПАЛІТЫКІ СССР 1917—1985 г. г. У 2-х тамах. — М., 1986. — 6 руб. 60 кап.

КАЛОМІНАЎ В. В. ФАЙНШТЭЙН М. Ш. Храм муз славесных. (З гісторыі Расійскай Акадэміі). — Л., 1986. — 55 кап.

КАЗЛОЎ В. П. Калумбы расійскіх старажытнасцей. (Старонкі гісторыі нашай Радзімы). — М., 1985. — 65 кап.

ЛАМАНОСАЎ М. В. Выбраныя працы. У 2-х тамах. — М., 1986. — 5 руб. 50 кап.

ПІПУНЫРАЎ В. Н., РАСКІН Н. М. Іван Пятровіч Кулібін. 1735—1818 г. г. (Навукова-біяграфічная серыя), — Л., 1986. — 1 руб. 10 кап.

ФАРМОЗАЎ А. А. Старонкі гісторыі рускай археалогіі. — М. 1986. — 1 руб. 10 кап.

Адрас магазіна «Кніга — поштай». 197345, г. Ленінград, Петразаводская вул, 7.

*Адукацыя ў свеце капіталу*

# ДАРАГІ ДЫПЛОМ

Два хмурыя джэнтльмены з капелюшамі ў руках жабруюць на вуліцы. На грудзях у іх плакаты з надпісамі: на адным — «Сын у каледжы», на другім —«Выпускнік каледжа сядзіць без работы». Гэтую карыкатуру змясціў часопіс прамысловых і дзелавых колаў ЗША «Бізнес уік».

У нашы дні кошт адукацыі ў амерыканскіх каледжах можа перавысіць суму ў 40 тысяч долараў. Гэта вялікае ўкладанне капіталу ў будучыню вашага дзіцяці, але яно не гарантуе выпускніку работу, якую ён хацеў бы атрымаць, прызнае «Бізнес уік».

Плата за вучобу ва універсітэтах розная. У дзяржаўным універсітэце Тэхаса, напрыклад, яна складае шэсць тысяч долараў у год. Многа, скажаце вы, але ў адной з самых прэстыжных вышэйшых навучальных устаноў Амерыкі, у прыватным Гарвардскім універсітэце гэта сума непараўнальна вышэйшая — 16145 долараў. І з кожным годам набыццё ведаў каштуе ўсё даражэй. За апошнія дваццаць гадоў плата за вучобу ўзрасла ў 3,5 раза. У будучым годзе яна павялічыцца яшчэ на шэсць працэнтаў. А к 1994 году прагназіруюць ужо штогадовае 10-працэнтнае павышэнне.

Каб аплаціць адукацыю, маладым людзям даводзіцца выкарыстоўваць крэдыт. З 1975 па 1984 год колькасць студэнтаў, якія бяруць пазыку для аплаты навучання, узрасла з 11 да 30 працэнтаў. Сярэдні ўзровень запазычанасці сярод студэнтаў павялічыўся за гэтыя гады амаль у чатыры разы —з 2100 да 7900 долараў. На практыцы гэта азначае, што на працягу некалькіх гадоў выпускнікі будуць выплачваць накопленыя даўгі. Для пачынаючых інжынераў гэтыя выплаты складуць 11 працэнтаў іх сярэдняга заработку. Медыцынская сястра вымушана будзе адлічваць значную долю — 21 працэнт свайго даходу. Служачыя сферы сацыяльнага забеспячэння і работнікі адукацыі — прыкладна ад чвэрці да трэці свайго заробтку.

Але ўсё гэта пры ўмове, што выпускніку ўдасца знайсці работу. Як паказвае рэчаіснасць, гэта ўдаецца зрабіць далёка не ўсім.

Амерыканскі часопіс «Ю. С. н'юс энд Уорлд рыпорт» лічыць, што адна з галоўных прычын павышэння платы за адукацыю тоіцца ў скарачэнні федэральнай дапамогі вышэйшым навучальным установам. За пяць гадоў знаходжання на чале ўлады сённяшняй адміністрацыі яна зменшылася прыкладна ў два разы.

«Палітыка ўразання расходаў на сацыяльныя патрэбы вядзе да паглыблення крызісу сістэмы вышэйшай адукацыі» — так пракаменціравала прадстаўлены ўрадам праект федэральнага бюджэту на бягучы фінансавы год тэлекампанія Сі-эн-эн.

**В. КАНДРАЦЕНКА.**

Рэдактар Ул. БАЛОГА.

А31403
«Гомельский университет» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ и профкомов Гомельского государственного университета (на белорусском языке), Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 1 друк. аркуш. Тыраж 2000 экз.
Наш адрас: вул. Савецкая, 104, п. 3-11, т. 57-16-52.
Заказ 22